**Тэматычны трэнажор па пунктуацыі для падрыхтоўкі да ЦЭ па беларускай мове (паводле твораў Уладзіміра Караткевіча)**

**Таццяна Іосіфаўна Ярэміч**,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай кваліфікацыйнай катэгорыі
Субацкай сярэдняй школы Ваўкавыскага раёна

# Тэматычны трэнажор па пунктуацыі для падрыхтоўкі да ЦЭ па беларускай мове (паводле твораў Уладзіміра Караткевіча, да 95-годдзя нараджэння пісьменніка)

**У 2025 годзе беларускай грамадскасцю будзе адзначацца 95-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча – аднаго з яркіх і самабытных пісьменнікаў XX стагоддзя.**

**Распрацаваны тэставы трэнажор па пунктуацыі можа быць выкарыстаны на ўроках беларускай мовы з мэтай праверкі і замацавання ведаў вучняў на пэўным этапе ўрока ці па тэме, раздзеле, пры правядзенні вынікаў за чвэрць ці навучальны год, пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага экзамену.**

**Старшакласнікі змогуць не толькі замацаваць веды аб правілах пастаноўкі знакаў прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах, удасканаліць уменне вызначаць межы прэдыкатыўных частак, заўважаць і выпраўляць памылкі ў пастаноўцы знакаў прыпынку, але і прасачыць жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Караткевіча, згадаць і спасцігнуць глыбокі філасофскі і гістарычны змест твораў пісьменніка, што вывучаліся ў праграмным курсе “Беларуская літаратура”.**

## Раздзел I. Складаназлучаны сказ

**1. Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку.**

1) Уладзімір Караткевіч, па сутнасці, стаў заснавальнікам беларускай гістарычнай раманістыкі_ і яго часта параўноўваюць з В.Скотам, Г.Сянкевічам *(Паводле Анатоля Вераб’я)*.

2) Выпадак для подзвігу мог надарыцца кожную хвіліну_ і крыўдна было яго прапусціць *(Кніганошы)*.

3) Дымелі спіны заморaных коней_ а за імі ледзь вымалёўваўся цёмны сілуэт лёгкай брычкі з падузнятым верхам *(“Паром на бурнай рацэ”)*.

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

4) Уладзімір Караткевіч навучыўся чытаць у тры з паловай гады_ а ў шэсць гадоў будучы пісьменнік пачаў складаць вершы *(Паводле Анатоля Вераб'я).*

5) Хан пачынаў гневацца, а паток людскі ўсё плыў ды плыў у расчыненыя дзверы скіта_ і няма, здавалася, яму ані канца ані краю *("Лебядзіны скіт").*

**2. Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх правільна расстаўлены знакі прыпынку паміж часткамі.**

1) У лепшых прадстаўнікоў тагачаснага грамадства (Беларэцкім, Яноўскай, Свеціловічу) выявіўся не толькі эстэтычны ідэал Караткевіча, але і ўвасобіліся характар, традыцыі, звычкі, светаадчуванне беларускага народа *(Паводле Анатоля Вераб'я).*

2) Спуджаны, я падтрымаў яе галаву і паднёс да вуснаў шклянку з вадою але яна ўжо апрытомнела *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

3) Мінула з таго часу трыццаць год, і мой звер даўным-даўно мірна заснуў у нетрах *("Былі ў мяне мядзведзі").*

4) Гораў прыклаў палец да губ і яна здагадалася, бязгучна расчыніла акенца *("Паром на бурнай рацэ").*

5) Мядзведзіка занеслі ў хату, і там маці, узяўшы яго на рукі, пачала мачаць палец у цёплае малако, і даваць яму злізваць *("Былі ў мяне мядзведзі").*

**3. Адзначце прыклады складаназлучаных сказаў, у якіх ёсць парушэнні пунктуацыйных нормаў.**

1) Часам на хвіліну абуджаецца сум, і хочацца ўпрыгожыць хату непаўторным старым ручніком або заматанай пасцілкай *("Зямля пад белымі крыламі").*

2) Даўным-даўно дзень аднойчы ўзышоў не ў сонечным святле, а ў зарыве пажараў і чорная копаць панеслася на захад *("Лебядзіны скіт").*

3) Дождж пачынаў сціхаць затое ўзняўся і гразіўся яшчэ больш памацнець вецер *("Паром на бурнай рацэ").*

4) Яны пакідалі балотную зямлю а за імі, быццам вішні, асыпалі лугі белым пухам сваіх кветак *("Лебядзіны скіт").*

5) Некалькі разоў ён імкнуўся быў за намі, але пахі першабытнага лесу перамагалі і ён усё аддаляўся *("Былі ў мяне  мядзведзі").*

**4. Адзначце толькі складаназлучаныя сказы.**

1) Прызыўна трубілі лебедзі, кружлялі, падалі на ваду, і ў крыках іх гучала радасць *("Лебядзіны скіт").*

2) Гораў быў ранены ў сутычцы з атрадам паўстанцаў пад Ракавам і адасланы "ў тыл" на лячэнне і адпачынак *("Паром на бурнай рацэ").*

3) Выцвілыя сінія вочы трошкі непаразумела, але спакойна глядзелі на забітага *(“Кніганошы”).*

4) Я ехаў з губернскага горада М. у самы глухі куток губерні на наёмным вазку, і мая экспедыцыя падыходзіла да канца *(“Дзікае паляванне караля Стаха”).*

5) Пераспелае жыта плакала зярнятамі, а ў жыце стаялі шыбеніцы *(“Паром на бурнай рацэ”).*

**Раздзел II. Складаназалежны сказ**

**1. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску(аў) трэба паставіць коску.**

1) Асаблівая заслуга Уладзіміра Караткевіча у тым_ што ён па-мастацку дасканала асэнсаваў мінуўшчыну роднага краю *(Паводле Анатоля Вераб’я).*

2) Што скажаш тады ты_ які заваяваў палову зямлі, не пасадзіўшы на сваёй нават рэпы і задаволіўшыся той часткай яе_ якая пасыплецца табе ў твой мёртвы рот *(“Лебядзіны скіт”).*

3) Прыбярэжнае насельніцтва_ якое жыло найбольш з рыбнай лоўлі_ было асуджана на голад *(“Паром на бурнай рацэ”).*

4) Магло б здацца_ што тут ніхто не жыве_ каб не палалі ў вялізным каміне дровы і не залівалі няпэўным, мігатлівым святлом усю гэтую карціну *(“Дзікае паляванне караля Стаха”).*

5) Маланкі крэслілі неба так часта_ што жоўты агеньчык свечкі стаў зусім няпэўны і непатрэбны *(“Паром на бурнай рацэ”).*

**2. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх правільна расстаўлены знакі прыпынку паміж часткамі.**

1) Каб зацікавіць чытачоў беларускай мовай, узняць яе прэстыж Уладзімір Караткевіч звяртаўся да дэтэктыўнага жанру *(Паводле Анатоля Вераб’я).*

2) Дождж ліў так што ўся зямля ў сляпучым святле бліскавіц укрывалася сінім мільгаценнем кропель *(“Паром на бурнай рацэ”).*

3) І зараз такая дабрыня і такі адчай адчуваліся ў яе словах, што я дараваў ёй гэтую гадзіну на ганку *(“Дзікае паляванне караля Стаха”).*

4) І ў Адама так задрыжалі вусны, што я не здзівіўся б каб ён, упершыню на маіх вачах, заплакаў *(“Чорны замак Альшанскі”).*

5) Я здагадваўся, што гэта віноўнік радавога праклёну яшчэ і таму, што твар гаспадыні няўлоўна збялеў *(“Дзікае паляванне караля Стаха”).*

**3. Адзначце прыклады складаназалежных сказаў, у якіх ёсць парушэнні пунктуацыйных нормаў.**

1) Калі аповесць “Дзікае паляванне караля Стаха” была напісана Уладзімірам Караткевічам у юнацкія гады то раман “Чорны замак Альшанскі”

быў закончаны ў 1979 годзе ўжо сталым і вядомым пісьменнікам *(Паводле Анатоля Вераб'я).*

2) А ён стаяў і глядзеў, як брычка, зрабіўшыся цёмнай кропкай, знікала недзе пад чорнымі хмаркамі ад якіх цягнуліся да зямлі шэрыя завесы дажджу *("Паром на бурнай рацэ").*

3) Памінаючы ліхам майго знаёмага, я сказаў фурману, каб ён ехаў хутчэй і шчыльна закруціўся ў плашч *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

4) Тады я падумаў, што ўмяцінкі могуць быць і на іншых аркушах і што я іх проста не заўважыў *("Чорны замак Альшанскі").*

5) Ён вытрымае найбольшыя пакуты спакойна і калі не памрэ ў турме ад прагі волі спакойна пойдзе на эшафот *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

**4. Адзначце толькі складаназалежныя сказы.**

1) Вам цікава будзе паслухаць дзіўную гісторыю і пасля сказаць, што яна вельмі падобна да выдумкі *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

2) Яго здзівілі вочы Леановіча, у якіх цяпер не было пустаты, а было мярцвянае здзіўленне *("Паром на бурнай рацэ").*

3) Але гэтыя ляскі з'яўляліся і знікалі, і зноў цягнулася раўніна, раўніна, бурая раўніна *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

4) Жанчына моўчкі глядзела на мокрыя лугі, што драмалі ў плямах скупога сонечнага святла *("Паром на бурнай рацэ").*

5) І яшчэ я адчуў, які ў гэтым доме стаіць жахлівы холад, якога не выгнаць нават камінамі, што гараць дзень і ноч *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

## Раздзел III. Бяззлучнікавы складаны сказ

**1. Адзначце толькі бяззлучнікавыя складаныя сказы.**

1) Уладзімір Караткевіч чэрпаў натхненне з вусна-паэтычнай творчасці, пісьменнік захапляўся чароўнай сілай мудрага народнага слова, маляваў мужных і самаахвярных беларусаў *(Паводле Анатоля Вераб'я).*

2) Тут было ўсё звычайным: імхі на купінах балотцаў, сухі верас паміж імі, мышка-малютка, якая цягнула з высокага бадзяка белы пух, відаць, у сваё гняздо, гатуючыся на зіму *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

3) Караткевіч быў нястомным вандроўнікам, шмат падарожнічаў па Беларусі і за яе межамі *(Паводле Анатоля Вераб'я).*

4) Нават у сне я жыў падзеямі ночы: бег, страляў, скакаў і адчуваў сам, што ногі мае рухаюцца, бягуць у сне *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

5) Я не мог нічога бачыць: лёгкі туман укрываў раўніну *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

**2. Адзначце сказ, у якім на месцы пропуску трэба паставіць коску.**

1) Едучы да канцавога пункта, герой У.Караткевіча назіраў малюнкі прывабныя_ віднеліся вёскі цэлымі калоніямі буслоў, магутныя лясы, высокія травы, асветленыя сонцам *(Паводле Т.І.Шамякінай).*

2) Я глянуў на свае ногі і жахнуўся_ яны амаль па калена былі ў бурай кашы, як у ботах *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

3) Полымя свечкі затрапятала_ адбіткі замітусіліся па камені *("Чорны замак Альшанскі").*

4) Відаць, пачуцці мае абвастрыліся_ я ўсё адчуваў на спіне чыйсьці позірк *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

5) Хвалі ішлі адна за адной_ процілеглы бераг губляўся ў чарнільнай навальнічнай цемры *("Паром на бурнай рацэ").*

**3. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е.**

1) Ёсць адзіны годны шлях_ аддана служыць Айчыне да крывавага поту, не чакаючы ўзнагароды ад людзей (Уладзімір Караткевіч).

2) Справа ішла больш чым пра хлеб_ справа ішла пра свабоду *("Паром на бурнай рацэ").*

3) Напэўна, гэта была таксама крамола_ не тутэйшыя кнігі, на тутэйшую гаворку ўжо даўно была накладзена афіцыйная забарона *("Кніганошы").*

4) І надвор'е, на такі выпадак, стала псавацца_ нізкія чорныя хмары паўзлі нам насустрач, там-сям з іх цягнуліся наўскос зямлі свінцовыя палосы дажджу *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

5) Масква толькі пачынае ажываць_ вяртаюцца з дач і маёнткаў людзі *("Паром на бурнай рацэ").*

**4. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы, у якіх няма парушэнняў пунктуацыйных нормаў паміж часткамі.**

1) Коні іхнія распасцерліся ў паветры, коннікі сядзелі нерухома верас звінеў пад капытамі *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

2) Дапамога была важнецкая: у руках старога вартаўніка я пабачыў стрэльбу *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

3) Віецца матавы гарох, пахне кропам і каноплямі, матылямі чырванее на градах мак, гудуць, вылятаючы з вулляў, пчолы *("Зямля пад белымі крыламі").*

4) Гэта было сапраўднае дзіва, нябачаны цуд: два чалавекі ў старажытных вопратках стваралі перад намі гэтую казку *("Дзікае паляванне караля Стаха").*

5) Станоўчыя героі аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха" выяўляюць светаадчуванне маладой нацыі, увасабляюць сапраўдную чалавечнасць і высакародства *(Паводле Т.І.Шамякінай).*

## Раздзел IV. Сказы з простай мовай

**1. Выберыце схему, якой адпавядае сказ з простай мовай (знакі прыпынку не ўсе расстаўлены).**

Сапраўды заваяванае народам, ім выпакутаванае забываць нельга з болем зазначаў Уладзімір Караткевіч і дадаваў яго трэба аберагаць, песціць, любіць

1) "П," – а.

2) "П, – а, – п".

3) "П! – а. – п".

4) А: "П!"

5) "П, – а: – П".

**2. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пры простай мове расстаўлены правільна.**

1) "У падзеях мінулага нашы карані, – сцвярджаў Уладзімір Караткевіч і дадаваў – А дрэва без каранёў не можа ні існаваць, ні, тым больш, прыносіць плады".

2) "Едзем з гэтай страшнай зямлі, дзе плачуць нават камяні і змагаюцца нават слабыя", – мармытнуў хан *("Лебядзіны скіт").*

3) Заканчваецца раман "Чорны замак Альшанскі" шматзначнай і красамоўнай фразай: "О, жыццё!" *(Паводле Анатоля Вераб'я).*

4) Вырашылі адвезці яго ў пятніцу, а ў чацвер здарылася тое, пра што бацька казаў, збялеўшы "Ну, пашанцавала" *("Былі ў мяне мядзведзі").*

5) Сам Уладзімір Караткевіч пра сябе любіў казаць "Я – беларускі Аляксандр Дзюма" *(Паводле Т.І.Шамякінай).*

**3. Адзначце сказы з простай мовай, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп'е.**

1) Уладзімір Караткевіч пісаў_ "Мне вельмі хацелася, каб людзі раптам адкрылі мора паэзіі ў беларускай гісторыі".

2) "Едзем з гэтай добрай зямлі, – сказаў Юсуфі і дабавіў_ – Хай светлае сонца ззяе над ёй" *("Лебядзіны скіт").*

3) Гаспадар стаіць на папялішчы і бядуе: "Ой, і пагарэў ты, Яўхім! Вой, і пагарэў! Ну й пагарэў! – і раптам _ – Але ж затое і мышэй ляснула!" *("Зямля пад белымі крыламі").*

4) Жыццё часам бывае настолькі падобнае на казку, што нельга не ўскрыкнуць "Ды не можа гэтага быць!" *("Зямля пад белымі крыламі").*

5) Вуснамі галоўнага героя рамана "Чорны замак Альшанскі" Уладзімір Караткевіч у эпілогу выказаў уласнае і запаветнае_ "Я адрабіў спаўна і па сваёй ахвоце сваю катаргу на зямлі. Я зрабіў нават болей таго, што мог. І не для сябе, а дзеля іх, дзеля гэтага акіяна, народа майго".

**Адказы**

| № п/п | Раздзел I | Раздзел II | Раздзел III | Раздзел IV |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1,2,3,4,5 | 1,2,3,4,5 | 1,5 | 5 |
| 2 | 1,3 | 3,5 | 3,5 | 2,3 |
| 3 | 2,3,4,5 | 1,2,3,5 | 1,2,3,4,5 | 1,2,3,4,5 |
| 4 | 1,4,5 | 1,4,5 | 2,4,5 | – |

**Літаратура**


1. Грамадчанка, Т. К., Беларуская літаратура: школьныя творы: кароткі змест і аналіз: 5 –11 класы/ Т.К.Грамадчанка. – 10 –е выд., перапрац. – Мінск : Аверсэв, 2010. – 572 с. – (Школьнікам, абітурыентам, навучэнцам).
2. Караткевіч, У., З вякоў мінулых: Апавяданні, аповесці: Для сярэд. і ст.шк. узросту/ Маст. А.Александровіч. – Мн. : Нар. Асвета, 1990. – 432 с.: іл., партр. – (Шк. Б-ка).
3. Караткевіч, У., Дзікае паляванне караля Стаха: Аповесць; Чорны замак Альшанскі: Раман. – Для сярэд. і ст.шк. узросту/ Прадм. А.Л.Вераб’я. – Мн. : Маст. Літ., 2000. – 574 с. – (Школьная бібліятэка).



ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА